# ЖЫЛЛЁВАЯ ПАЛІТЫКА Ў БССР
# У ПЕРЫЯД НОВАЙ ЭКАНАМІЧНАЙ ПАЛІТЫКІ (1921–1928 ГГ.): ПРАКТЫЧНЫ І ІДЭАЛАГІЧНЫ АСПЕКТ

**Т. У. Пецюкевіч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск;*
*tanya-Enott@yandex.ru;*
*навук. кір. – А. Ф. Паддубская, канд. гіст. навук, дац.*

У выніку інтэнсіўнай міграцыі ў гарады ў 1920-я гады адбываецца абвастрэнне жыллёвага пытання, што робіць дзяржаўную жыллёвую палітыку актуальным напрамкам сацыяльнай палітыкі. Вырашэнне жыллёвага крызісу савецкі ўлады імкнуліся злучыць з рэалізацыяй утапічнага праекта па фарміраванню «новага чалавека». У дадзенай рабоце пытанне жылля разглядаецца комплексна: як сукупнасць мерапрыемстваў па практычнаму вырашэнню пытання жыллёвага крызісу, так і як адзін са сродкаў ажыццяўлення ідэалагічных праектаў.

***Ключавыя словы:*** жыллёвая палітыка; муніцыпалізацыя; дом-камуна; камунальная кватэра; «новы чалавек»; «новы быт».

Жыллёвая палітыка – гэта адзін з прыярытэтных напрамкаў дзяржаўнай сацыяльнай палітыкі, які вызначаецца роляй жылля як адной з асноўных патрэб чалавека і з'яўляецца неад'емнай часткай паўсядзённага жыцця. У слове-знаку «дом» закадаваны пэўныя прыкметы матэрыяльнай культуры і элементы ментальнасці. Абвастрэнне жыллёвага пытання ў БССР у 1920-я гг., выклікане інтэнсіфікацыяй міграцыйных патокаў з вёскі, вызначыла актуальнасць жыллёвай палітыкі для дзяржавы, якая ў вырашэнні праблемы імкнулася злучыць практычны і ідэалагічны аспекты.

На працягу 1920-х гадоў жыллё і ўсе маніпуляцыі з ім уваходзілі ў сферу кампетэнцый Галоўнага кіравання камунальнай гаспадаркі НКУС (Глаўкамхоза), якое з'яўлялася суб'ектам рэалізацыі дзяржаўнай жыллёвай палітыкі. Глаўкамхоз быў абавязаны суадносіць свае дзеянні з агульным напрамкам працы адпаведнага органа РСФСР. Свае функцыі Глаўкамхоз выконваў як у дачыненні да рэспублікі, так і непасрэдна да сталіцы – ён рабіў справаздачу Мінгарвыканкаму і фінансаваўся з гарадскога бюджэту. У 1924 г. пытанні кіраўніцтва і арганізацыі камунальнай гаспадаркі горада Мінска былі перададзены ад Глаўкамхоза да Камунальнага аддзела Мінгарвыканкама [6, с. 1].

На працягу 1920-х гг. у жыллёвым сектары дамінаваў прыватнаўласніцкі фонд, але зямля, на якой знаходзіліся жылыя будовы, належала дзяржаве. Перавага прыватнага сектара лічылася неперспектыўнай, бо ў будучым яго поўнасцю павінен быў замяніць дзяржаўны сектар. Адным з асноўных напрамкаў жыллёвай палітыкі ў

1920-я гады стала муніцыпалізацыя, якая разглядалася як самы перспектыўны сродак выйсця з жыллёвага крызісу. Стварэнне дзяржаўнага жыллёвага фонда было завершана да 1926 г. і яго памер склаў болей за 35 % усіх домаўладнняў [3, с. 107]. Але камунальныя адзелы не заўсёды маглі фінансаваць увесь камунальны фонд, таму мела месца частковая дэмуніцыпалізацыя. З пункту гледжання эфектыўнасці муніцыпалізацыя сябе не апраўдала, бо назіралася тэндэнцыя змяншэння колькасці жылплошчы на душу насельніцтва: калі ў 1923 г. на душу насельніцтва прыпадаў 6,1 кв. м жылплошчы, то ў 1924 г. – 5,9 кв. м пры пры санітарнай норме ў 8, 1 кв. м [7, с. 113].

Не здолеўшы вырашыць жыллёвае пытанне з дапамогай муніцыпалізацыі, дзяржава ў 1924 г. дазволіла жыллёвую кааперацыю. Па сутнасці, гэта была вымушаная мера, якая не суадносілася з савецкай ідэалогіяй, але па прычыне няздольнасці вырашыць праблему недахопу жылля сваімі сіламі ўлады пайшлі на дадзены крок. Адна з формаў кааператыўнага аб’яднання – ЖАКТы – на працягу 1920-х гг. разглядалася дзяржавай у якасці асноўнай формы эксплуатацыі муніцыпальнага фонду.

Фарміраванне таксы на квартплату насіла класавы характар. У механізме фарміравання квартплаты савецкая ўлада сутыкнулася з дылемай: з аднаго боку, для нармальнага функцыянавання жыллёвай гаспадаркі такса павінна была пакрываць сабекошт, з другога – неабходна было захаваць класавы прынцып [2, с. 30]. Па гэтай прычыне жыллёвая сфера пастаянна адчувала дэфіцыт фінансавых сродкаў, што негатыўна адбівалася на ступені забеспячэння жыллём насельніцтва і яго якасці.

Дваццатыя гады былі часам эксперыментаў і спробаў рэалізацыі ўтапічных праектаў з мэтай фарміравання «новага чалавека», які павінен быў прасоўваць дзяржаву ў светлую камуністычную будучыню [5, с. 173]. Найбольш прыдатным матэрыялам для дадзенай мэты лічыўся пралетарыят, якога трэба было пазбавіць індывідуалістычных інстынктаў. Галоўная роля ў гэтым адводзілася жыллю: выхоўваць калектывізм планавалася ў дамах-камунах. Пад дадзенай назвай меліся на ўвазе дамы з агульнымі памяшканнямі для адпачынку, адукацыі, дзіцячых гульняў і прыватнай прасторай для кожнага жыхара. У дамах-камунах планавалася сфарміраваць працоўна-бытавыя калектывы – групы людзей, аб’яднаных як працоўнымі, так і бытавымі сувязямі. Улада дабіваласяператварэння працы і быта ў адзіны непадзельны комплекс чалавечых адносінаў, дзе асабістыя паводзіны будуць рэгуляваца калектывам, як гэта адбывалася ў сялянскай грамадзе.

У камунах рэалізоўвалася палітыка «новага быта», якая ў якасці стандарта вызначала мінімум сродкаў забяспячэння жыццядзейнасці чалавека. Прапагандавалася барацьба супраць «мяшчанства», праявамі якога лічылася выкарыстанне шэрагу рэчаў – разнастайных бытавых прадметаў і мэблі, відаў адзення, прычосак. Імкненне да добраўпарадкавання жылля таксама лічылася мяшчанствам.

Асабліва цяжка паўсядзённае жыццё ўспрымала антырэлігійную палітыку, бо царква рэгламентавала паўсядзённы расклад чалавека. Ажыццяўляліся спробы замяніць рэлігійную абраднасць савецкай: абрад царкоўнага хрышчэння саступаў месца «чырвоным хрэсьбінам» ці «звяздзінам», вянчанне ў царкве – «чырвонаму вяселлю», класічнае пахаванне з адпяваннем – пахаванню чырвонаму [4, с. 172].

Адной з ключавых задач на шляху фарміравання «новага чалавека» была эмансіпацыя жанчыны, галоўнымі абавязкамі якой цяпер станавіліся праца і грамадская дзейнасць. Вызваліць жанчыну ад хатняй працы планавалася за кошт будавання пры камунах сталовак, пральняў і г.д., а выхаванне дзяцей павінна было ўзяць на сабе грамадства.

Калі ідэалам мікракосма ідэальнага рэвалюцыйнага сусвету быў дом-камуна, то мікракосмам савецкай рэчаіснасці стала камуналка. Гэта адбылося па прычыне недахопу сродкаў на будаванне дамоў-камун і ўсіх абслугоўваючых іх прадпрыемстваў і падабенствам дома-камуны ў тым выглядзе, які ўлада магла прапанаваць, да рабочага барака. Таму было прынята рашэнне аб рассяленні рабочых у кватэры буржуазіі і былой інтэлігенцыіі. Пры гэтым колькасць жыхароў на аднаго павінна была перавышаць колькасць пакояў. Дадзены прынцып і паклаў пачатак нараджэнню феномена камунальнай кватэры.

Камуналку нельга назваць правадыром «новага быта», але такі працэс, як страта чалавекам індывідуалізму, быў характэрны і для камуны, і для камунальнай кватэры. Цесната ў камуналцы стала прычынай утварэння стану спецыфічнай аголенасці чалавека, калі яму немагчыма пабыць у адзіноце, калі парушаецца асабістая мікракамунікацыя з матэрыяльнымі артэфактамі яго жыцця [8, с. 5]. Цесната таксама была коранем напружанасці і амаль усіх канфліктаў. Камуналка характарызавалася «празрыстасцю» прасторы, якая стварала сітуацыю «бог бачыць усё, суседзі – яшчэ больш» [1, с. 181] і выключала магчымасць арганізаванага супраціўлення ўладзе. Жыццё ў камунальнай кватэры фармавала пэўны тып менталітэту – менталітэт жыхара камуналкі, які стаў важнай складаючай фундамента, на якім сфарміруецца манументальны тып «савецкага чалавека».

Эмансіпацыя жанчыны адбывалася на прапагандысцка-дэкларатыўным узроўні і прыводзіла да выпраўленне традыцыйнай

гендарнай сіметрыі. У выніку стваралася нейкая уніфікаваная мадэль пола і гендарнай ідэнтычнасці, калі сацыяльная роля мужчыны і жанчыны вызначаліся аднолькава, робячы пры гэтым папраўку на біялагічныя прыкметы пола.

Дваццатыя гады былі ўнікальным часам у савецкай гісторыі, калі краіна ператваралася ў своеасаблівую творчую лабараторыя, у якой спрабавалі рэалізаваць шэраг утапічных праектаў. Эксперыменты ў галіне паўсядзённасці, прадстаўленыя палітыкай «новага быта» і рухам за стварэнне камун, напрыканцы 1920-х гадоў былі згорнуты. Камунальнае жыллё, утворанае ў выніку савецкай жыллёвай палітыкі перыяду НЭПа, працягнула сваё існаванне. Разам з механізмам размеркавання жылля, якое насіла класавы характар, яно, з аднаго боку, садзейнічала фарміраванню чалавека з пэўнымі характэрнымі рысамі, а з другога – у час разгортвання таталітарнай сістэмы дапамагала забяспечваць кантроль над насельніцвам.

### Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Бойм С.* Общие места. Мифология повседневной жизни. М., 2002.
2. *Бураков В. Н.* Квартирная плата в БССР в межвоенный период // Веснік Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова. 2013. № 2. С. 26–32.
3. *Бураков В. Н.* Муниципализация жилищного фонда в БССР (1919–1929) // Вестник Полоцкого государственного университета. 2013. № 9. С. 106–109.
4. *Гужалоўскі А. А.* Сэксуальная рэвалюцыя ў Савецкай Беларусі: 1917–1929 гг. Мн., 2017.
5. *Лебина Н. Б.* Повседневная жизнь советского города: Нормы и аномалии. 1920–1930 годы. СПб.. 1999.
6. О мероприятиях по ликвидации жилищного кризиса в г. Минске, 1926 г. // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Фонд 265. Воп. 1. Спр. 1871.
7. Цыркуляр Галоўнага кіравання камунальнай гаспадаркай, 1922 г. // НАРБ. Фонд 691. Воп. 1. Спр. 1.
8. *Сохань И. В.* Долой кухонное рабство! // Женщина в российском обществе. 2011. № 3. С. 1–7.